сложного феномена следует принять творчество Аристотеля. Именно он создал *систему* философских категорий и, используя их, описал механизм функционирования общества и основных его институтов.

Список использованной литературы


1. Семенов, Ю.И. Философия истории. (Общая теория, основные проблемы, идеи и концепции от древности до наших дней) / Ю.И. Семенов. – М.: «Современные тетради», 2003. – 776 с.
2. Доброхотов, А.Л. Логос / А.Л. Доброхотов // Новая философская энциклопедия: В 4 т. – Т. 2. – М.: Мысль, 2010. – С. 445–447.
3. Мтериалисты Древней Греции. Собрание текстов Гераклита, Демокрита и Эпикура. – М.: Госполитиздат, 1955. – 238 с.
4. Асмус, В.Ф. Античная философия. Учебное пособие. Изд. 2-е, доп. / В.Ф. Асмус. – М. : «Высш. школа», 1976. – 543 с.
5. Платон. Государство //Платон. Собрание сочинений: в 4 т. – Т. 3. – М.: Мысль, 1994. – С. 79–420.
6. Аристотель. Сочинения: в 4 т. / Аристотель. – Т. 4. – М.: Мысль, 1983. – 830 с.


## ПАРАТЭАТРАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР’Я: НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАМІНАЛЬНЫХ ГАЛАШЭННЯЎ


*І.А. Алексніна*
*г. Мінск, БДУКМ, inna.aleksnina.70@mail.ru*



**Целью статьи** является изучение паратеатральных форм белорусской театральной культуры: на примере похоронных плачей жителей Белорусского Поозерья.



**Ключевые слова:** Белорусское Поозерье, региональная культура, дотеатральные формы, паратетральные формы, народное драматическое творчество, семейно-бытовая обрядность, похоронные плачи, древнегреческая трагедия.


Фальклорныя запісы, зробленыя беларускімі даследчыкамі ў канцы XX стагоддзя, сведчаць аб даволі ўстойлівым захаванні так званых “датэатральных формаў” творчасці народа, асабліва ў невялікіх паселішчах Беларусі, дзе і па сённяшні дзень не існуе ні прафесійных, ні аматарскіх калектываў. Таму аўтар артыкула лічыць, што разглядаць гэтыя з’явы толькі як першапачатковую ступень развіцця больш дасканалых формаў, відаў і жанраў мастацкай творчасці не правамоцна і прапануе замест тэрміна “датэатральныя формы творчасці” выкарыстоўваць паняцце “паратэатральныя формы народнай культуры”.

У яго (у адрозненне ад паратэатральных дзействаў “сармацкага барока” XVIII ст., даследаваных і апісаных Г.І. Барышавым [1, с. 85–98]) мы ўключаем тэатральныя элементы ў сямейна-бытавой абраднасці; “каляндарныя святкаванні карнавальнага тыпу” (па М.М. Бахціну) з пераапрананнямі, калядаваннем, валачобніцтвам; святочныя ігрышчы тыпу “Жаніцьба Цярэшкі”; парадыйныя сцэнкі пераапранутых; фальклорна-гульнявое выканальніцтва – адным словам, усе віды і формы творчасці народа, якія ўзнікаюць на хісткай мяжы рэчаіснасці, абраду і тэатра.

Сярод спецыфічных асаблівасцей народнай драматычнай творчасці можна вылучыць 1) дзеянне; 2) неабходнасць пераўвасаблення ў той ці іншы вобраз з выкарыстаннем вядомых народнай традыцыі сродкаў ігры; 3) зараджэнне эстэтычнай функцыі дзеяння і пераўвасаблення чалавека (у адрозненне ад практычнай, рытуальна-магічнай ці культавай функцыі), якая выяўляе сябе ў элементах мастацкай



Репозиторий ВГУ

вобразнасці [2, с. 5; 3, с. 52]. Усе гэтыя рысы, на наш погляд, можна знайсці і ў пахавальных галашэннях беларусаў.

Пахавальныя звычаі і рытуалы з'яўляюцца завяршальным звяном у сямейна-бытавой абрадавай творчасці народа. Іх вывучэнне (і ў прыватнасці, даследванне памінальных галашэнняў), маюць вельмі глыбокія гістарычныя карані. Сярод навукоўцаў, якія спачатку вывучалі, а пасля і сістэмазавалі пахавальныя абрады (у тым ліку, і галашэнні), можна назваць прозвішчы Я. Ласіцкага, К. Фалютынскага, Л. Галэнбоўскага, А. Рыпіньскага, Я. Тышкевіча, П. Шпілеўскага, М. Дзмітрыева, Ю. Крачкоўскага, П. Шэйна, Е. Раманава, А. Шлюбскага, А. Катлярэўскага, У. Сысова, Т. Варфаламеевай іінішых. Тым не менш, пахавальныя галашэнні разглядалася імі пераважна з пункту гледжання этнаграфічна-фальклорнай традыцыі беларусаў, а ніяк не як частка элемента народнай драматычнай творчасці народа, якая ўваходзіць у сістэму паратэатральнай культуры нашага народа.

Завяршальным звяном у сямейна-бытавой абраднасці з'яўляюцца, як вядома, жалобныя звычаіі рытуалы. Неад'емнымі кампанентамі пахавальнага і памінальнага абрадаў былі плачы з імправізаваным прыгаворам, так званыя галашэнні. Слёзныя галосныя імправізацыі на пахаваннях і памінках уяўляюць поўную супрацьлегласць смехавой культуры, тым не менш, калі апошняя спрыяе своеасабліваму катарсісу душы праз станоўчыя эмоцыі, то першыя былі скіраванымі на той жа катарсіс, толькі праз узмацненне драматызму, трагічнасці.

Вядомы беларускі даследчык гэтай традыцыі Змітрок Бядуля называў галашэнні на хаўтурах аднымі з першых формаў у паэзіі, таму што галашэнне "... творыцца не штучна, а ліецца з набалелай душы, з гаротнага сэрца проста, не задумваючыся аб тым, як сказаць свае словы, каб яны выходзілі прыгажэйшымі" [4, с. 26].

Трэба заўважыць, што гісторыя пахавальных плачаў паходзіць са старажытнага Егіпту іІндыі, а вобраз плакальшчыцы сустракаецца ў антычнай літаратуры, эпасах Скандынавіі, Францыі, рускіх летапісах [5, с. 41]. На першы погляд, можа падацца, што пахавальныя галашэнні не маюць ніякага дачынення да народнай драматычнай творчасці. Тым не менш, давайце прыгледзімся да іх больш уважліва.

Шматлікія даследчыкі фальклорнай традыі пахавальных галашэнняў на Беларусі сцвярджаюць, што спецыяльных "прафесійных" плакальшчыц на Беларусі не было: жанчын у беларускіх вёсках вучылі галасіць з дзяцінства. Галашэнне – такое тонкае майстэрства, якое патрабавала таленту, прадуманай унутранай лініі дзеяння, майстэрства валодання словам, пэўных артыстычных здольнасцей, спалучэння традыцыі з імправізацыяй. Патрабаванні да выканальніцтва такога тыпу народных твораў вельмі высокія, прадыктаваныя глыбокім пачуццямі мастацкасці і меры, якія заўсёды жывуць у нашым народзе.

Ужо ў пералічаных рысах галашэння можна знайсці элементы тэатра, тым больш, што жанчыны вучыліся галасіць у больш вопытнай вясковай галосніцы, што вельмі нагадвае устойлівую традыцыю фальклорнага тэатра падрыхтоўкі акцёра "з голаса" (як, напрыклад, у народных драмах "Цар Ірад", "Цар Максімільян"). Але, тым не менш, нас больш цікавяць выключэнні з правіл, калі найбольш здольных да гэтай справы жанчын аднавяскоўцы спецыяльна запрашалі. Напрыклад, так было ў вёсцы Германавічы Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Гэтых жанчын тут называлі "галосніцамі", таму што плакалі "на голас" (мелодыю), мелі свой спецыяльны сцэнарый, але ў залежнасці ад асобы нябожчыка, яго чалавечых рыс і якасцей, імі выкарыстоўваліся і імправізацыі. У апошні час (канец 90-х гг. ХХ стагоддзя) у гэтай вёсцы галасіць не прынята [6].

Традыцыя пахавальных галашэнняў (у параўнанні, нарыклад, з рэкруцкімі ці вясельнымі) на Беларусі з'яўляецца найбольш распаўсюджанай і ўстойлівай і не выяўляе значных рэгіянальных адрозненняў. Выключэннем можна назваць толькі тое,



Рэпазіторый ВДУ

што ў Пастаўскім і Браслаўскім раёнах сучаснай Віцебскай вобласці працягвалі галасіць і пасля заходу сонца, што не было характэрна для іншых рэгіёнаў Беларусі. Тут не мела значэння і месца галашэння – ці то ў хаце, ці то ў хляве, ці то на полі – у залежнасці ад псіхалагічнай неабходнасці плакальшчыцы (у дадзеным выпадку, блізкай нябожчыку радні).

Нягледзячы відавочную суб'ектыўнасць пахавальных галашэнняў, дзе кожная галосніца імкнулася да выражэння сваіх пачуццяў, шукала ўласныя словы, сэнсавыя іінтанацыйныя ацэнкі [5, с. 71], і ў выпадку галашэння па родным чалавеку, і ў выпадку запрашэння "прафесійнай" плакальшчыцы, гэта абрад публічнага выражэння гора. Лічылася, што чым больш людзей прысутнічала на хаўтурах, тым лепш. Многія хадзілі на пахаванне не толькі праводзіць у апошні шлях знаёмага ці аднавяскоўца, але і паслухаць галашэнні.

Менавіта гэты факт дазваляе выказваць меркаванне, што пахавальныя галашэнні аказалі даволі значны ўплыў на развіццё сусветнага тэатральнага мвстацтва. Гэта відавочна ў адносінах да старажытнагрэчаскай трагедыі. Звернемся, напрыклад, да тэксту трагедыі Эсхіла "Персы", а менавіта, да сцэны вяртання цара Ксеркса пасля разгрому яго войска афінянамі: Ксеркс: Вздохни, вздохни , о горе и домой иди! / Хор: Увы, вздыхаю и скорблю! / Ксеркс: Моим стенаньям стоном вторь! / Хор: Делам плачевным отзвук – плач. / Ксеркс: С моим ты согласуй свой плач! / Хор: Увы! Увы! / Ксеркс: О, бремя горя тяжкое! / Хор: Боль неизбывной скорби! / Ксеркс: Бей в грудь! Бей в грудь руками! Обо мне восплачь! / Хор: Сам слёз достойный, плачу я. / Ксеркс: Моим стенаньям стоном вторь! / Хор: Не мог бы не стенать я, царь! / Ксеркс: Вопль громкий подыми, взывай! / Хор: Увы! Увы! … [7, с. 6-7]. На наш погляд, прыведзены дыялог красамоўна сведчыць аб безумоўным уплыве пахавальных галашэнняў старажытнай Грэцыі на фарміраванне і развіццё яе драматургіі і тэатральнага мастацтва.

Што тычыцца нашай краіны, то пытанне непасрэднага ўплыву паратэатральных форм народнай творчасці (у тым ліку, і значнай часткі сямейна-бытавой абраднасці беларусаў – пахавальных плачаў) на фарміраванне драматургіі і прафесійнага тэатральнага мастацтва пакуль што застаецца адкрытым, як і пытанне вывучэння паратэатральных форм народнай культуры беларусаў у пачатку XXI стагоддзя, якія асабліва ярка праяўляюць сябе ў тых культурна-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі, дзе няма ніводнай прафесійнай тэатральнай установы.

Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Барышев, Г.И. / Г.И. Барышев / Театральная культура Белоруссии XVIII века. – Минск: Наука и техника, 1992. – 293 с.
2. Гусев, В.Е. / В.Е. Гусев / Народные игры, драмы и театр // Этнография восточных славян: очерки традиционной культуры. – М., 1987. – С. 45.
3. Гісторыя беларускага тэатра: У 3 т. / Гал. рэд. У.І. Няфёд. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – Т.1.: Беларускі тэатр ад вытокаў да кастрычніка 1917 года. – 496 с.
4. Бядуля, З. / З. Бядуля / Беларускія інтэрмедыі і інтэрлюдыі да школьнай драмы і камедыі ў XVII – XVIII стагоддзях // Вестник народного комиссариата просвещ. БССР. –Мінск, 1922. – Вып. 11. – С. 26;
5. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / Рэд. А.С. Фядосік; – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с. – (Беларус. нар. творчасць / АН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).
6. Інфармацыя запісана аўтарам артыкула ў 1997 г. ў вёсы Германавічы Шаркаўшчынскага раёна ад Антаніны Бярнардаўны Аляхновіч (1920 г.н.).
7. Эсхил, Софокл. Трагедии. – Пер. с др. Гр. – М.: "РИПОЛ КЛАССИК", 2001. – 752 с.


Рэпазіторый ВДУ